# ВОБРАЗНАЕ ЎВАСАБЛЕННЕ БЕЛАРУСКАГА ЧАСУ Ў РАННЯЙ ПАЭЗІІ ЯНКІ КУПАЛЫ

**Еўтуховіч Елізавета (УА МДПУ імя І. П. Шамякіна, Беларусь)**
**Навуковы кіраўнік – П. Р. Кошман, канд. філал. навук, дацэнт**

Янка Купала адносіцца да ліку тых пісьменнікаў, якія кардынальна паўплывалі на станаўленне беларускай літаратуры. Яго творчасць наглядна прадэманстравала магчымасці паэтычнага слова ў выяўленні свету беларусаў, стала ў айчыннай літаратурнай традыцыі кананічным узорам грунтоўнага мастацкага спасціжэння быцця народа, яго гісторыі, культуры і звычаяў.

Роля Янкі Купалы ў станаўленні беларускай літаратуры як нацыянальнага мастацтва абумоўлівае неабходнасць даследавання яго паэтычнай спадчыны як працэсу рэпрэзентацыі і стварэння вобразаў-індыкатараў беларускай адметнасці. Асабліва важнымі для разумення ўплыву беларускага класіка на фарміраванне нацыянальнага паэтычнага светаўспрымання бачацца элементы купалаўскага верша, звязаныя з асэнсаваннем катэгорыі часу. Вызначэнне іх вобразнага ўвасаблення і ідэйнага зместу складае мэту дадзенага артыкулу.

Часавыя каардынаты паэтычнага свету Янкі Купалы залежаць найперш ад той камунікатыўнай сітуацыі, якая мадэліруецца ў яго вершах. Купалаўскі лірычны герой гаворыць ад імя беларускага народа або для народа, а таму мае неабходнасць быць са сваімі субяседнікамі тут і зараз. Яго размова вядзецца пераважна ў цяперашнім часе і падпарадкавана выяўленню актуальнага стану жыцця беларусаў. У аўтарскай карціне свету гэта найперш малюнкі сялянскага побыту, якія выяўляюць неўладкаванасць і цяжкую працу. Тыповы абразок беларускай рэчаіснасці ў купалаўскім выкананні выдатна ілюструюць наступныя радкі: “Вецер хаткаю калоце // І па шчылінах галосіць // Гаспадар злёг ад калоцця // З дзяцьмі жонка есці просіць” [1, с. 85].

Нараканні на нешчаслівую долю народа ў вершах Янкі Купалы не маюць дакладнага гістарычнага вытлумачэння. Паэт толькі часам пад уплывам фальклорнай традыцыі згадвае пра варожыя для чалавека містычныя істоты. Вобразы ведзьмаў ці чарцей у такім выпадку паўстаюць элементамі міфалагічнага светаўспрымання, час якога характарызуецца цыклічнасцю і выяўляе адвечны канфлікт сіл дабра і зла: “Толькі шнур мой вузкі // Град аполе, пажне, // І залом ведзьмакі // Заплятуць на мяне” [1, с. 200].

Пазітыўнае ўспрыманне беларускага мінулага ўзнікае ў творах Янкі Купалы якраз тады, калі выяўленыя ў іх вобразы набываюць канкрэтныя гістарычныя адпаведнікі. Так, у вершы “З мінуўшых дзён” паэт малюе ідэалізаваную карціну з былых часоў: згадвае пра Русь, “голас вечавы”, успамінае “Палачан” і “Мянчан”, войска Усяслава. Але ўсе гэтыя памятныя адзнакі мінулага аўтар падае ў кантэксце сучаснасці, якая выглядае ў параўнанні з такім гераічным мінулым шэрай, пазбаўленай вартасці.

Расказваючы пра былую славу, паэт клапаціўся пра сваіх сучаснікаў, дзяліўся з імі ўяўленнем пра багатую гістарычную спадчыну роднага краю. Акцэнтуючы ўвагу на несправядлівасць свайго часу, паэт і яго герой спадзяюцца на змены. Разам з выяўленнем чарады аднастайных дзён,

напоўненых адвечнымі нараканнямі на нешчаслівую долю, купалаўскія вершы фіксуюць і новае ўспрыняцце часу, звязанае з адчуваннем яго гістарычнасці. Герой Янкі Купалы адчувае надыход моманту, вызначальнага для лёсу беларускага народа, чуе "песні дзіўныя такія <…> аб шчасці люду ўсяго" [1, с. 62], перажывае, што іх "звон" можа не дайсці да тых, каму ён адрасаваны.

Важным укладам Янкі Купалы ў развіццё беларускага наратыву пачатку XX стагоддзя паўстае вылучэнне ім праблемы будучага. Гэты часавы вектар выразна праяўляецца ў знакамітым вершы "А хто там ідзе?". "З верша, – па словах В. Рагойшы, – паўстае вобраз беларускага народа дарэвалюцыйнага часу – агромністай грамады, якая рушыла ў паход па сваё чалавечае шчасце" [2, с. 105]. Вобраз шляху, па якім ідуць беларусы, адлюстроўвае ў сімвалічнай форме беларускі час як рух з мінулага з яго "крыўдамі", праз сучаснасць з яго "бядой і горам", да будучага з яго мэтай – "людзьмі звацца". Акадэмік Я. Бабосаў адзначае значнасць гэтых купалаўскіх слоў: "Тут нацыянальнае самавызначэнне і вызваленне ўсведамляецца ў неразрыўным адзінстве з сацыяльным вызваленнем" [3, с. 78]. Гэтым уяўленнем аб прызнанні нацыянальнай і чалавечай годнасці беларусаў Янка Купала фармуляваў ідэю агульнага будучага.

Такім чынам, творчасць Янкі Купалы пачатку XX стагоддзя надала выяўленню нацыянальнага вобраза свету цэласны часавы выгляд. Падпарадкоўваючы свой паэтычны талент актуальным праблемам свайго часу, аўтар паказваў яго у цеснай сувязі з мінулым і будучым народа і тым самым фарміраваў адчуванне адказнасці ў сваіх чытачоў перад продкамі і нашчадкамі.

*Артыкул падрыхтаваны пры фінансавай падтрымцы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь па дагаворы № 1410/2021.*

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Купала, Я. Поўны зб. тв. : у 9 т. / Янка Купала. – Мінск : Маст. літ., 1995. – Т. 1. : Вершы, пераклады 1904–1907. – 462 с.
2. Рагойша, В. Янка Купала / В. Рагойша // Беларуская літаратура : вучэб. дапам. для 9 кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / В. У. Праскаловіч [і інш.]. – Мінск : Нац. інс-т адукацыі, 2019. – С. 95–116.
3. Бабосов, Е. М. У истоков белорусской национальной идеи / Е. М. Бабосов // Беларуская думка. – 2016. – № 10. – С. 77–82.

## ТЕКСТООБРАЗУЮЩАЯ ФУНКЦИЯ В ПОЭЗИИ ВЛАДІМІРА МАЯКОВСКОГО

**Зарожина Елизавета (УО МГПУ им. И. П. Шамякина)**
**Научный руководитель – А. А. Станкевич, д-р филол. наук, профессор**

В поэзии Владимира Маяковского, великого русского поэта XX века, особое внимание уделяется игре слов, нестандартной лексике и ярким образам. Использование текстообразующей функции позволяет не только создавать удивительные звучащие стихи, но и вносить глубокие смысловые акценты, превращая слова в мощные инструменты выражения своих идей и эмоций. Данная функция – это прием в поэзии, заключающийся в изменении